Пролетары! Усіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 290 (359)
СЕРАДА
18
СНЕЖНЯ
1940 г.

Цана 10 капеек.

Выбары ў мясцовыя Советы на тэрыторыі Карэла-Фінскай ССР і заходніх абласцей Украіны і Беларусі яшчэ раз паказалі ўсяму свету таржаство ідэі совецкай улады, сілу і арганізаванасць совецкага народа, яго згуртаванасць вакол сцяга партыі Леніна—Сталіна, яго гатоўнасць самаадданa змагацца за таржаство комунізма!

Бліскучая перамога сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

Дзень 15 снежня 1940 года ўвойдзе ў гісторыю Карэла-Фінскай ССР, заходніх абласцей Украіны і Беларусі яркай і незабываемай датай. У гэты дзень працоўныя новай саюзнай рэспублікі і новых совецкіх абласцей выбралі сваіх дэпутатаў у мясцовыя Советы. Гэтымі выбарамі тут завершана перабудова органаў дзяржаўнага кіравання на аснове Сталінскай Канстытуцыі. Перад працоўнымі Карэла-Фінскай ССР і заходніх абласцей Украіны і Беларусі, якія выбралі ў мясцовыя органы ўлады сваіх лепшых сыноў і дачок, адкрыліся новыя бліскучыя перспектывы далейшага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Тэлеграф прынёс пакуль толькі папярэднія даныя аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных Карэла-Фінскай ССР, заходніх абласцей Украінскай і Беларускай ССР. З публікуемых сёння ў «Правде» паведамленняў бачна, што ў заходніх абласцях Украінскай ССР у галасаванні прыняло ўдзел не менш 98 процантаў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў, у заходніх абласцях Беларускай ССР—не менш 99 процантаў і ў Карэла-Фінскай ССР не менш 98 процантаў. Усе дэпутаты, выбраныя ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, — кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных. Усё гэта ярчэй усякіх слоў паказвае маральна-палітычнае адзінства выбаршчыкаў, іх згуртаванасць вакол партыі Леніна — Сталіна, усе мерапрыемствы якой нязменна карыстаюцца найшырэйшай падтрымкай народных мас. У гэтых даных выражана любоў новых совецкіх грамадзян да соцыялістычнай радзімы, імкненне зрабіць яе яшчэ больш магутнай.

Усякі чэсны, мыслячы чалавек зразумее, што такая актыўнасць выбаршчыкаў магчыма толькі ва ўмовах соцыялізма, ва ўмовах поўнага таржаства соцыялістычнага дэмакратызма.

Дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных паўсямесна азнаменаваўся высокім палітычным уздымам. Выбаршчыкі ішлі на выбары з пачуццём велізарнай радасці, з сазнаннем вялікіх правоў, прадастаўленых ім Сталінскай Канстытуцыяй. Апускаючы выбарчыя бюлетэні ў урны, кожны новы совецкі грамадзянін ясна аддаваў сабе справаздачу ў тым, што ён выконвае вялікую дзяржаўную справу, што ён аддае свой голас лепшым прадстаўнікам народа.

На шматлікіх перадвыбарчых сходах і мітынгах выбаршчыкі глыбока і ўсебакова азнаёміліся з сваімі кандыдатамі—людзьмі, на справе даказаўшымі сваю адданасць народу, сваю гатоўнасць аддаць усе сілы па дабро соцыялістычнай радзімы, на барацьбу за яе шчасце і далейшае працвітанне.

Пачуцці мільёнаў выбаршчыкаў, якія ўдзельнічалі 15 снежня ў выбарах, выдатна выразілі працоўныя Львова. На 150-тысячным перадвыбарчым мітынгу, які адбыўся напярэдадні дня выбараў, яны прынялі прывітанне таварышу Сталіну, выразіўшы яму ад усяго сэрца ўдзячнасць і сыноўнюю любоў.

«Мы шчаслівы, — гаворыцца ў гэтым прывітанні, публікуемым сёння ў «Правде»,—паведаміць Вам, дарагі таварыш Сталін, што 257 прадпрыемстваў Львоўскай областці датэрмінова выканалі гадавыя планы. У сёлах растуць калгасы. На вялікім вопыце калгасаў СССР, на прыкладзе маладых калгасаў заходніх абласцей Украіны сялянства пераконваецца ў перавазе аграмаджанай гаспадаркі. На вызваленай зямлі мацнее дружба працоўных усіх нацыянальнасцей. расцвітае соцыялістычная культура украінскага народа, з'еднанага ў адзінай украінскай совецкай дзяржаве».

Новыя совецкія грамадзяне, усяго 15 месяцаў назад вырваныя з свету капіталістычнага рабства, цяпер нароўні з усім совецкім народам паўнапраўна карыстаюцца ўсімі дабротамі Сталінскай Канстытуцыі. Найвялікшыя перамены ў іх жыцці, якія адбыліся за гэты час, паказалі ім усе перавагі соцыялістычнага ладу. Яны на ўласным прыкладзе пераканаліся ў тым, што толькі совецкая ўлада нясе працоўным збаўленне ад сваволъства эксплаататараў, ад мук беспрацоўя, галечы, беззямелля, ад нацыянальнага прыгнёту, што толькі совецкая ўлада адкрывае найшырэйшыя магчымасці для росквіту ўсіх галін народнай гаспадаркі.

Вось чаму новыя совецкія грамадзяне аднадушна галасавалі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Апускаючы ў урны свае бюлетэні, выбаршчыкі ведалі, што яны зрабілі правільны выбар, што іх дэпутаты будуць чэснымі і вернымі слугамі народа, бо— яны плоць ад плоці народа. Служыць народу, выражаць яго інтарэсы, змагацца за шчасце народа— вось благародная задача совецкага дэпутата.

Першыя свабодныя выбары ў мясцовыя органы ўлады, якія адбываліся на тэрыторыі заходніх абласцей Украіны і Беларусі, з'явіліся незабываемай дэманстрацыяй усеперамагаючай сілы соцыялістычнага дэмакратызма. Ці даўно ў гэтых гарадах і сёлах, пры правядзенні выбараў у польскі сейм, працоўныя падвяргаліся нечуваным паліцэйскім рэпрэсіям? Гэтыя чорныя дні сваволля беззваротна канулі ў вечнасць. Народ ішоў 15 снежня на выбары, як на радаснае свята, ведаючы, што ён выбірае сваіх сапраўды народных прадстаўнікоў у свае сапраўды народныя органы ўлады.

Дружная яўка і высокая арганізаванасць, якія назіраліся на ўсіх выбарчых участках,—яркі паказчык таго высокага пачуцця грамадзянскага доўгу, якім былі ахоплены ў гэты дзень мільёны новых совецкіх грамадзян.

Захаваўшыяся яшчэ дзе-ні-дзе ў новых совецкіх абласцях астаткі варожых класаў імкнуліся правакацыйнымі чуткамі адпугнуць асобных малаўстойлівых людзей ад удзелу ў выбарах. Але варожыя прошукі разбіваліся ўшчэнт сілай большэвіцкай арганізаванасці. Самі выбаршчыкі давалі ім неадкладны і рашучы адпор.

У яркую дэманстрацыю совецкага патрыятызма ператварыўся дзень выбараў і на тэрыторыі Карэла-Фінскай ССР, з'яўляючайся магутным фарпостам соцыялістычнай дзяржавы на нашых паўночна-заходніх рубяжах. З выключным аднадушшам галасавалі працоўныя рэспублікі за сваіх кандыдатаў. Задоўга да сканчэння тэрміну галасавання ў выбарчыя ўрны была апушчана большасць бюлетэняў. Пасылаючы ў мясцовыя Советы прадстаўнікоў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, працоўныя Карэла-Фінскай ССР выражалі сваю гатоўнасць аказваць ім у іх дзяржаўнай рабоце ўсямерную падтрымку. На адным выбарчым участку ў Петразаводску выбаршчык тав. Крэза перадаў будучым дэпутатам гарадскога Совета свой наказ. Гэты невялікі дакумент ярка характарызуе тую неразрыўную сувязь, якая існуе ў нас паміж органамі ўлады і працоўнымі масамі. У гэтай неразрыўнай сувязі— магутная непераможная сіла совецкага ладу.

— Жадаю новых сіл нашым выбраннікам, каб яны маглі лепш служыць народу,—пісаў у сваім наказе тав. Крэза. Ён даў наказ дэпутатам паўсядзённа клапаціцца аб дабрабыце і камунальнай гаспадарцы горада, паляпшаць работу гандлёвых арганізацый, павялічваць колькасць магазінаў у рабочых раёнах і т. д. Выбаршчык пісаў наказ сваім будучым дэпутатам у цвёрдай упэўненасці, што яны выканаюць яго, бо ён ведаў, што адрасуе яго выбраннікам народа, людзям, для якіх інтарэсы народа — вышэй за ўсё.

Мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у Карэла-Фінскай ССР і заходніх абласцях Украіны і Беларусі выбраны. Паводле паведамленняў акруговых выбарчых камісій, працоўныя Карэла-Фінскай ССР выбралі 5.699 дэпутатаў, працоўныя заходніх абласцей Украінскай ССР — 79.010 і заходніх абласцей Беларускай ССР—39.934. Гэта—велізарная армія новых дзеячоў совецкай улады на мясцах. Перад дэпутатамі, аблечонымі высокім давер'ем народа, стаяць велізарныя задачы. Апіраючыся на падтрымку шырокіх мас працоўных, паўсядзённа ўмацоўваючы сувязь з імі, уноў выбраныя дэпутаты павінны з усёй энергіяй узяцца за далейшае развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, за дабрабыт гарадоў і пасёлкаў, павінны чула прыслухоўвацца да ўсіх заяў працоўных, клапаціцца аб задаволенні іх культурных і бытавых патрэб. Памятаючы аб патрабаваннях выбаршчыкаў, з якімі яны выступалі на шматлікіх перадвыбарчых сходах і мітынгах, уноў выбраныя дэпутаты абавязаны на чале ўсёй сваёй дэпутацкай работы паставіць клопаты аб умацаванні эканамічнай і ваеннай магутнасці нашай радзімы.

Адказныя задачы стаяць перад дэпутатамі новых совецкіх абласцей. Нельга забываць, што яшчэ нядаўна тут гаспадарылі капіталісты і памешчыкі. Пры падтрымцы совецкага народа працоўныя заходніх абласцей Украіны і Беларусі скінулі эксплаататараў з сваіх плеч. Але астаткі варожых класаў і іх прыхвасні яшчэ дзе-ні-дзе захаваліся. Дэпутаты мясцовых Советаў у нашых новых абласцях павінны заўсёды быць пільнымі на сваім пасту, павінны рашуча змагацца са спробамі ворагаў нарушыць інтарэсы соцыялістычнай дзяржавы. Выбраннікі народа абавязаны заўсёды быць на варце совецкіх законаў, выхоўваць у насельніцтва пачуцці павагі да совецкіх законаў, патрабаваць ад кожнага грамадзяніна няўхільнага выканання сваіх абавязкаў перад соцыялістычнай дзяржавай.

Выбары ў мясцовыя Советы на тэрыторыі Карэла-Фінскай ССР і заходніх абласцей Украіны і Беларусі яшчэ раз паказалі ўсяму свету таржаство ідэі совецкай улады, сілу і арганізаванасць совецкага народа, яго згуртаванасць вакол сцяга партыі Леніна—Сталіна, яго гатоўнасць самаадданa змагацца за таржаство комунізма!

(Перадавы артыкул «Правды» за 17 снежня 1940 г.).

ПАПЯРЭДНІЯ ДАНЫЯ АБ ВЫБАРАХ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ У ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БЕЛАРУСКАЙ ССР

МІНСК, 16 снежня. (ТАСС). Прэзідыумам Вярхоўнага Совета Беларускай ССР атрыманы ад Акруговых выбарчых камісій агульныя даныя аб выніках выбараў 15 снежня 1940 года ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях.

Паводле папярэдніх даных Акруговых выбарчых камісій у галасаванні прыняло ўдзел не менш 99 процантаў агульнай колькасці выбаршчыкаў. Паводле паведамленняў Акруговых выбарчых камісій выбрана 367 дэпутатаў у абласныя Советы дэпутатаў працоўных, 4.182 дэпутаты ў раённыя Советы, 2.400 дэпутатаў у гарадскія Советы і 32.985 дэпутатаў у сельскія і пасялковыя Советы.

Усе выбраныя дэпутаты ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных з'яўляюцца кандыдатамі блока комуністаў і беспартыйных.

Пры выбарах насельніцтва паказала высокую палітычную актыўнасць і арганізаванасць.

Дзень выбараў у гарадах і вёсках нашай вобласці



На здымку: Маладыя выбаршчыкі студэнты Пединстытута галасуюць на Чырвонаармейскім выбарчым участку № 6.

Фота А. Сапіра

З РАДАСНЫМІ ПЕСНЯМІ

ЧЫЖЭЎ. **(Па тэлефону).** К 5 гадзінам раніцы 15 снежня на Каленчынскі выбарчы ўчастак арганізавана з сцягамі прышлі выбаршчыкі чатырох вёсак, каб прагаласаваць першымі.

На Чыжэўскі сельскі выбарчы ўчастак у 5 гадзін 20 мінут прыехалі калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна. У калгасе засталося толькі два вартаўнікі. Калгаснікі ехалі на добрых конях, спявалі песні. Калі яны праязджалі праз мястэчка Чыжэў, іх ветліва сустракалі жыхары.

На Андрэеўскі выбарчы ўчастак да пачатку галасавання сабралося больш 150 чалавек. 102-гадовая выбаршчыца прыслала на выбарчы ўчастак свайго ўнука, каб той папрасіў членаў выбарчай камісіі прыйсці да яе на кватэру з урнай, бо яна сама не магла з'явіцца на ўчастак.

Ва ўсім раёне галасаванне праходзіла арганізавана. Да 12 гадзін дня на 100 процантаў закончылі галасаванне Каленчанскі і Шульбоўскі выбарчыя ўчасткі. Дзень выбараў у раёне адзначан, як вялікае ўсенароднае свята. З усіх вёсак і пасёлкаў выбаршчыкі ішлі на ўчасткі з песнямі і музыкай. Галасаванне ў асноўным было закончана да 10 гадзін вечара.

С. Талкачоў,
сакратар райкома партыі.

★ ★ ★

За партыю, за Сталіна!

ЗАМБРАВА. **(Па тэлефону).** Дзень выбараў у Замбраўскім раёне прайшоў арганізавана пры вялікай актыўнасці выбаршчыкаў. У Стара-Закшэўскім сельсовеце выбаршчыкі з'явіліся на выбарчы ўчастак да пачатку галасавання. У Менжэнінскім сельскім совеце на ўчасткі выбаршчыкі прышлі к 4 гадзінам ночы. Яны прынеслі з сабой лозунгі. Былы батрак Владзіслаў Кучынскі прышоў на ўчастак з жонкай. Апускаючы ў урну бюлетэнь, ён заявіў: «Я галасую за партыю, за лепшага друга працоўных—за таварыша Сталіна. Няхай доўгія годы жыве вялікі Сталін».

На Стара-Закшэўскі выбарчы ўчастак у 4 гадзіны ночы з вёскі Тобенц прышоў 74-гадовы Ракоўскі. Разам з Ракоўскім на выбарчы ўчастак прышло 40 другіх сялян вёскі Тобенц.

Па ўсіх акругах у раёне дэпутатамі выбраны кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

—о—

Дэманстрацыя совецкага патрыятызма

ГРОДНА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Гасцінна сустракаў 6 выбарчы ўчастак, які знаходзіўся ў памяшканні Верцялішскага сельсовета, сваіх выбаршчыкаў. Участак быў упрыгожан рукамі выбаршчыц, якія прынеслі сюды свае каўры, дарожкі. К пачатку галасавання на ўчастак сабралося каля 100 чалавек. Першай на ўчастак з вёскі Галігнічы прышла 70-гадовая сялянка беднячка Анна Емельянаўна Башкевіч. Апускаючы бюлетэнь у выбарчую урну, яна дзякуе ўрад, партыю і таварыша Сталіна за клопаты аб сялянах.

З вялікай радасцю прышлі на ўчастак і прагаласавалі калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Леніна.

— Галасуючы за сваіх кандыдатаў,—заявілі яны,—мы галасуем за сваё заможнае жыццё.

У дзень выбараў на ўчастку і ў клубе былі наладжаны масавыя танцы, песні. Драмгурток клуба паказаў пастаноўку, прадэманстравалі сваю самадзейнасць і школьнікі.

Дружна прагаласавалі калгаснікі і аднаасобнікі Верцялішак за вылучаных кандыдатаў. Да двух гадзін дня тут прагаласавалі ўсе выбаршчыкі. Выбары ў мясцовыя Советы выліліся ў яркую дэманстрацыю совецкага патрыятызма.

Г. Лупсякоў.



На здымку: На фабрычным выбарчым участку № 8 у г. Беластоку.
Першыя прышлі галасаваць Сабалеўская Э. І. 72 годы, яе дачка Шылак С. Ф. 50 год і ўнучка Шылак Я. Я. Фота А. Сапіра.

БЛІСКУЧЫЯ ВЫНІКІ

У 6 гадзін старшыня камісіі тав. Розін аб'яўляе выбаршчыкам першага выбарчага ўчастка горада Беластока аб пачатку галасавання.

— Таварышы,—сказаў ён,— віншую вас з днём выбараў. Прашу прыступіць да выканання свайго грамадзянскага доўгу.

Памяшканне напоўнілася выбаршчыкамі. Уперадзе ўсіх стаяць муж і жонка Казлоўскія. Майсей Ісідаравіч мае 58-гадовы працоўны стаж. Цяпер ён працуе брыгадзірам у арцелі «Чырвоны молат».

— Хочам першымі галасаваць за нашых кандыдатаў,—заяўляе ён. Казлоўскія першымі атрымліваюць бюлетэні.

Адзін за другім надыходзяць выбаршчыкі.

Да 12 гадзін прагаласавала большасць выбаршчыкаў, а да 4 гадзін—99 процантаў. Роўна ў 7 гадзін 30 мінут увечары заходзіць апошні па спіску выбаршчык, які быў у камандзіроўцы. Ён апускае бюлетэні ў урну, міма якой прайшлі ўсе 1450 выбаршчыкаў участка.

12 гадзін ночы. Члены ўчастковай выбарчай камісіі ўскрываюць урну і пачынаюць падлік галасоў. Рэзультаты радасныя — сталінскі блок комуністаў і беспартыйных атрымаў бліскучую перамогу.

Еф. Барнасус.

Па Совецкай краіне

ДОМ-МУЗЕЙ В. І. ЛЕНІНА ВА УФЕ

УФА. На вуліцы Дастаеўскага, у доме № 78, адкрываецца музей В. І. Леніна. У гэтым доме ў 1900 годзе жыла Н. К. Крупская, якая адбывала тады ссылку ва Уфе; тут-жа ў час сваіх прыездаў ва Уфу затрымліваўся Владзімір Ільіч Ленін.


В. І. Ленін быў ва Уфе ў 1900 годзе два разы: у лютым, калі ён вяртаўся з ссылкі з сяла Шушэнскага, і ў чэрвені, перад ад'ездам за граніцу. У другі раз Владзімір Ільіч прыехаў разам з сваёй мацер'ю і сястрой Аннай Ільінічнай Елізаравай і прабыў ва Уфе больш месяца. Ён правёў рад нарад па пытанню арганізацыі агульнарускай палітычнай газеты.

ПАМЯЦІ В. П. ЧКАЛАВА

У Цэнтральным доме Грамадзянскага паветранага флота ў Маскве адбыўся вечар памяці вялікага лётчыка—Валерыя Паўлавіча Чкалава. Тут сабраліся лётчыкі, інжынеры і тэхнікі паветранага флота, стаханаўцы прадпрыемстваў сталіцы— каля 1.000 чалавек. Сярод прысутнічаючых—народны камісар авіяцыйнай прамысловасці СССР тав. Шахурын, намеснік начальніка Галоўнага Упраўлення Грамадзянскага паветранага флота тав. Картушэў, тав. Ем. Яраслаўскі, Героі Совецкага Саюза.

З ўспамінамі аб В. П. Чкалаве выступілі Героі Совецкага Саюза тт. Смушкевіч, Юмашаў і Туржанскі.

Удзельнікі схода з вялікім уздымам прынялі прывітанне тав. Сталіну.



Дом па вуліцы Горкага, пабудаваны паводле праекту архітэктара М. І. Сіняўскага. Журы конкурса прызнала яго адным з лепшых дамоў, збудаваных у Маскве ў апошнія пяць год.
Фота Г. Шырокава.

Фота ТАСС.

ЭКСПАНАТЫ НА ВЫСТАЎКУ 1941 ГОДА

КРАСНАДАР. Калгасы і соўгасы Краснадарскага края вядуць работу па адбору экспанатаў на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку 1941 года.

Соўгас «Міхайлаўскі перавал» адправіў у Маскву на зімовае захаванне 960 кілаграмаў лепшых сартоў яблыкаў і арэхаў «трапезунд».

Калгас імені Калініна, Пашкоўскага раёна, таксама накіраваў гародніну ў колькасці 2-х цэнтнераў.

ГІСТОРЫЯ ПЕЦЕРБУРГА—ПЕТРАГРАДА—ЛЕНІНГРАДА

ЛЕНІНГРАД. У план ленінградскага аддзялення Інстытута гісторыі Акадэміі навук СССР уключана работа над выданнем пяцітомнай «Гісторыі Пецербурга-Петраграда-Ленінграда». Аб'ём кожнага тома—40—45 друкаваных лістоў. Да работы над выданнем прыцягваюцца навуковыя супрацоўнікі рада ленінградскіх інстытутаў і ўстаноў, дзеячоў навукі, літаратуры і мастацтва.

ЯК ЗМАГАЛІСЯ Ў СНЕЖНІ 1905 ГОДА

У Калонным зале Дома саюзаў адкрываецца выстаўка, прысвечаная 35-годдзю снежаньскага ўзброенага паўстання. Рэдкія дакументы, фатаграфіі, лістоўкі, карціны і рэліквіі ярка адлюстроўваюць гераічную барацьбу большэвіцкай партыі па надрыхтоўцы і арганізацыі паўстання.

Асаблівую цікавасць прадстаўляюць дакументы і экспанаты, якія аднаўляюць карціну гераічнай барацьбы маскоўскага пролетарыята. Наведвальнікі выстаўкі ўбачаць усе віды ўзбраення маскоўскіх дружыннікаў: бомбы-македонкі, карабін-вінтоўку, шашкі, мадэлі кінжалаў. Радам са зброяй—брашура «Кароткае кіраўніцтва па вулічнаму бою».

ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У ГАРАДАХ І ВЁСКАХ НАШАИ ОБЛАСЦІ

★ ★ ★

ГАЛАСУЮЦЬ СЯЛЯНЕ ВЁСКІ СТУДЗЯНКА

Вёска Студзянка. Выбарчы ўчастак № 3. Скромна, але з густам абсталявана памяшканне. 50 выбаршчыкаў — сяляне-аднаасобнікі, калгаснікі, сельская інтэлігенцыя— прышлі на ўчастак задоўга да пачатку галасавання. Уважліва слухалі яны ўступную прамову старшыні ўчастковай камісіі агранома Л. І. Ратнера, які роўна ў 6 гадзін раніцы абвясціў пачатак выбараў і запрасіў выбаршчыкаў прыступіць да галасавання. Былыя батракі, беднякі і серадпякі, а зараз калгаснікі сельгасарцелі імені Варашылава, працоўныя сяляне, якім совецкая ўлада забяспечыла шчаслівае жыццё, горда прад'яўляюць свае совецкія пашпарты, атрымліваюць бюлетэні і беражліва нясуць іх да урны. Яны выбіраюць дэпутатаў сельскага, раённага і абласнога Советаў дэпутатаў працоўных. У сельскі Совет балатыруецца 18 кандыдатаў — калгаснікаў, працоўных сялян-аднаасобнікаў, сярод іх 4 жанчыны. У раённы Совет балатыруецца Владзімір Нікалаевіч Гаўрылюк — старшыня калгаса, селянін гэтай-жа вёскі Студзянка, Леаніда Осіпаўна Кулікоўская — ткачыха 7-га тэкстыльнага камбіната, а ў абласны Совет —Казімір Феліксавіч Вішнеўскі.

Да урны падыходзіць селянін з вёскі Студзянкі—78-гадовы Горка Нікалай Пятровіч.

— Галасую за совецкую ўладу,— не без гордасці гаворыць ён.

І сапраўды, селяніну Горка ёсць чым гардзіцца і радавацца. Не зайздроснае жыццё ў яго ў мінулым: гаротнае дзяцінства, жыццё на поўчвэрці надзела зямлі вялікай сям'ёй, потым падзел сям'і, а разам і падзел вузкіх сялянскіх шнуроў. Свайго хлеба не хапала. Хадзіў на заработкі да лесапрамыслоўца Гіміка. Валіў лес. вазіў. І ледзь хапала на хлеб.

Сапраўднае жыццё ўбачыў Нікалай Пятровіч з прыходам Чырвонай Арміі, з устанаўленнем совецкай улады. «Цяпер можна кусаць хлеб на ўвесь рот»,—гаворыць ён. Сын Іван аддзяліўся, у калгасе брыгадзірам працуе, не забывае старога, дапамагае. Зяць таксама ў калгасе. Стары гардзіцца сваёй сям'ёй, сваёй раднёй, совецкімі парадкамі.

І за ўсё гэта, за светлае жыццё, забяспечанае яму на старасці год, за чалавечыя і грамадзянскія правы, і за многае яшчэ, чаго не можа Нікалай Пятровіч выказаць словамі, горача дзякуе ён совецкую ўладу, таварыша Сталіна.

Члены ўчастковай камісіі тт. Мелькоўскі, Цітоў, Крыўчык, Макарэвіч і Цімашэўскі на фурманках і веласіпедах аб'ехалі з урнамі хворых выбаршчыкаў у вёсках Захады, Целічанка, Падсупрасель, Ялоўка, Гараднянка, Студзянка і далі ім магчымасць прыняць удзел у выбарах.

Да 2 гадзін дня на ўчастку прагаласавала 93 процанты ўсіх выбаршчыкаў.

Поспех выбараў не прышоў сам сабой. Яго заваявалі сваёй работай агітатары сяляне-аднаасобнікі тт. Маліноўскі і Аблажэвіч, настаўніца Мышкова, комсамолец - настаўнік Копцелеў, сакратар сельсовета Жукоўскі і іншыя, якія шырока праводзілі агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў.

Весела і радасна праходзіць дзень выбараў у калгасе імені Варашылава. У клубе моладзь наладзіла танцы, ігралі скрыпкі і гармонікі, звонка разліваліся вясёлыя песні.

Т. Лясовіч,
М. Семашка.

Актыўнасць выбаршчыкаў

ЛАПЫ. **(Па тэлефону).** Дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных на ўсіх выбарчых участках раёна прайшоў як вялікае свята працоўных. Амаль 100-процантнай яўкай на выбарчыя ўчасткі і аднадушным галасаваннем за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных выбаршчыкі яшчэ раз прадэманстрыравалі сваю шчырую любоў да совецкай улады, партыі Леніна — Сталіна, социялістычнай бацькаўшчыны працоўных усяго свету.

На Лапскі выбарчы ўчастак № 4 к 4 гадзінам 30 мінутам сабралося 25 выбаршчыкаў. Усе яны спадзяваліся прагаласаваць першымі. Аднак гэтае права дасталося 70-гадоваму выбаршчыку Данцыгеру Софілю і маладой выбаршчыцы Пайковіч Марыі, галасаваўшай першы раз. Яны з'явіліся на выбарчы ўчастак першымі.

— Галасую за совецкую ўладу і самую справядлівую партыю ў свеце — комуністычную партыю. — заявіў стары Данцыгер, апускаючы бюлетэнь у урну.

— Галасую за сваю социялістычную радзіму, краіну маладосці і шчасця, — сказала 18-гадовая Марыя Папковіч, апускаючы адначасова з Данцыгерам бюлетэнь у урну.

На Лапскім выбарчым участку № 2 першымі прагаласавалі ліцейшчык паравоза-вагонарамонтнага завода Станіслаў Яблонскі з жонкай Аляксандрай Антонаўнай.

— Совецкая ўлада выратавала мяне ад беспрацоўя і забяспечыла шчаслівае жыццё. Я спакойны за заўтрашні дзень. — сказаў тав. Яблонскі.

На трэцім выбарчым участку гор. Лапы 72-гадовая выбаршчыца Філіновіч заявіла, што пры ўладзе польскіх капіталістаў і памешчыкаў яна ні разу не галасавала, што тады выбары праходзілі міма яе, і толькі зараз яна з радасцю галасуе за кандыдатаў народа.

У галасаванні па Лапскаму раёну прыняла ўдзел 99,5 процанта ўсіх выбаршчыкаў.

Н. Ражкоў.



На здымку: Выдача бюлетэняў для тайнага галасавання на 5-м Мазавецкім выбарчым участку ў Беластоку.

Фота А. Сапіра

Дзень вялікай радасці

Здавалася, што горад Беласток у гэтую ноч не засыпаў. На вуліцах, асабліва ля ўваходаў у выбарчыя ўчасткі, гарэлі яркія агні.

Жыхары ў доме № 18 па Ковенскай вуліцы прачнуліся рана. У кватэры № 7 жыве ткач 17-ай фабрыкі Абрам Шмуйлевіч Строт. Прачнуўся ён, калі яшчэ не было 5 гадзін. Ён тарапіў жонку:

— Спознімся, Лея, прагаласуем не першымі.

Ахопленыя хвалюючай радасцю, яны вышлі на вуліцу. Ля ўвахода ў выбарчы ўчастак № 3 па Сасновай былі першыя выбаршчыкі.

— Ведаеш, спазніліся,—непакоілася жонка.

— Нічога, і мы першымі прагаласуем,—супакоіў яе Абрам. Першым бюлетэнь атрымаў закройшчык абутковай фабрыкі № 3 тав. Галамбовіч, за ім супругі Строт, затым 65-гадовы Штэймарт—сторож горхарчпрома.

Уходзячы, Абрам Шмуйлевіч сказаў жонцы:

— Вялікі дзень для нас сёння. Такіх дзён за гэты год было больш, чым за ўсё маё жыццё. Падумай сама: мы сталі роўнапраўнымі, атрымалі пастаянную работу, мы галасуем за сваіх людзей з народа. Другое жыццё наступіла.

У доме № 1 па Гапенскай вуліцы быў хворы Бабольскі Лейб. Прыўзняўшыся на локці, ён радасна прывітаў прыехаўшых членаў выбарчай камісіі.

— Я думаў, што аба мне забылі,—сказаў ён, усхвалявана апускаючы бюлетэні ў урну.

У кватэры № 7 па Ковенскай вуліцы грамадзянка Пострыгач Элька ляжала нерухомай. Убачыўшы ўвайшоўшых, у яе заіскрыліся слёзы.

— Дзякую Сталіну, што я спакойна за сябе і за сваіх дзяцей.

Дзень толькі пачаўся, а на вуліцах апранутыя па-святочнаму ідуць і ідуць выбаршчыкі, каб выканаць высокі абавязак грамадзяніна. Усе яны аддаюць свае галасы за сыноў і дочак вызваленага народа.

А. Астаф'еў.

Аддалі галасы за верных сыноў народа

Урачыста ўпрыгожан участак № 3, 4-й Совецкай выбарчай акругі г. Беластока. Партрэты, лозунгі, плакаты, ілюмінацыя, каўры і зелень—усё з густам было падрыхтавана і расстаўлена.

Добра абсталявана памяшканне ўчастка. Яшчэ задоўга да 6 гадзін сабраліся выбаршчыкі, каб першымі аддаць свае галасы. Роўна ў 6 гадзін старшыня ўчастковай камісіі тав. Скулкін аб'яўляе пачатак галасавання. Першым апускае бюлетэнь Верчэнк Нікалай Канстанцінавіч з сваёй жонкай Зеніт Ірынай Ігнацьеўнай. За імі ідуць Пташэк Шолэм Ізраілевіч з сям'ёй, Шафра Іоха Шоламаўна і іншыя.

Шэршнева Марыя Цімафееўна першы раз прымае ўдзел у галасаванні. Ёй толькі нядаўна споўнілася 18 год.

Да 10 гадзін вечара ўсе выбаршчыкі 94-й акругі 3-га выбарчага ўчастка прагаласавалі. Усяго прыняла ўдзел у галасаванні 99,6 процанта выбаршчыкаў.

Гэта аднадушша сведчыць аб непераможнасці сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, дэманстрыруе выключную любоў да социялістычнай радзімы.

Ў 12 гадзін участковая камісія прыступіла да падліку галасоў.

А. Есіповіч.

★ ★ ★

НА ЎЧАСТКУ № 4

Дом, дзе змяшчаецца выбарчы ўчастак № 4, можна было ўбачыць яшчэ здалёку. Яркія агні электрычнасці вабілі сваім хараством.

Прышла Хана Рафаілаўна Ткач. Яна проста, ад душы расказвае старшыні выбарчай камісіі свае затоеныя пачуцці.

— Галасаваць першай хачу. Вось ужо на двух выбарах не адставала і на гэты раз хочацца першай прагаласаваць.

Гэта было ў 11 гадзін ночы напярэдадні вялікага дня. Ткач, паслухаўшы параду таварышоў з выбарчай камісіі, пайшла дамоў адпачыць. Але ў 3 гадзіны яна зноў прышла на ўчастак і чакала пачатку галасавання.

Настала доўгачаканая мінута. У 6 гадзін раніцы старшыня выбарчай камісіі звярнуўся да прышоўшых выбаршчыкаў з кароткай прамовай.

Дабро пажалаваць! Прашу прыступіць да выканання свайго грамадзянскага доўга.

Галасаванне пачалося! Але тут з выбаршчыцай Ткач, якая прышла першая на ўчастак, вышла недарэчнасць. Яна так спяшыла на ўчастак, што забыла ўзяць з сабой пашпарт.

Адным з першых галасаваў дырэктар ф-кі № 32 т. Топаль. Ён прасядзеў у польскай турме 12 год і 8 месяцаў. Задоўга да пачатку галасавання ён з'явіўся на выбарчы ўчастак. Прыходзіць сям'я Катушэнка—бацька, матка і дачка. Апускаючы бюлетэнь, выбаршчык Пуплыкіна ўсклікае: «за лепшых сыноў нашай радзімы».

Прыходзяць галасаваць цэлыя сем'і, убеленыя сівізнай старыя. Усе яны гараць адным жаданнем, адным пачуццём—выканаць свой доўг перад радзімай.

А. Іваноў.

Усенароднае свята

БЕЛЬСК. **(Па тэлефону).** У прадранішнім змроку тускла свецяць электрычныя лямпачкі. На высокай вежы будынка райвыканкома гадзіннік паказвае 5 гадзін раніцы. Вуліцы горада ўпрыгожаны чырвонымі сцягамі, на фасадах дамоў—партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, лозунгі, сцягі. Незвычайнае ажыўленне.

Роўна ў 6 гадзін раніцы старшыня ўчастковай выбарчай камісіі № 4 тав. Радута аб'яўляе пачатак галасавання і віншуе выбаршчыкаў з усенародным святам. Першыя выбарчыя бюлетэні атрымлівае 60-гадовая сялянка Францышка Грыневецкая. Апускаючы бюлетэні, яна гаворыць:

— Я ніколі не галасавала пры ўладзе польскіх паноў. Хто хацеў лічыцца з сялянкай-бяднячкай! Я толькі і ведала, што працавала на памешчыкаў і капіталістаў, а зараз, дзякуючы совецкай уладзе, стала роўнапраўнай грамадзянкай і сёння галасую за кандыдатаў народа, за далейшы росквіт нашай цудоўнай радзімы.

Дружна галасавалі за сваіх кандыдатаў сяляне вёскі Мора, Арлянскага сельсовета. Да 12 гадзін дня прагаласавалі ўсе выбаршчыкі гэтага ўчастка.

У вёсках Кашэлі, Аўгустова і Гацькі да 2 гадзін дня галасаванне было закончана. Да двух гадзін дня па раёну прагаласавала 23.252 выбаршчыкі.

У асноўным падача галасоў на ўсіх выбарчых участках была закончана да 6 гадзін вечара.

В. Круглік,
А. Пысін.

Выключная актыўнасць

Выбаршчыкі 6-га Каліноўка-Касцельніцкага выбарчага ўчастка, Кнышынскага раёна, арганізавана з'явіліся на выбарчы ўчастак і да 17 гадзін усе як адзін аддалі свае галасы. Усяго за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных на ўчастку галасавала 99,9 процанта выбаршчыкаў.

Такому поспеху выбараў спрыяла старанная падрыхтоўка і ініцыятыва мясцовага сельскага актыва, энергічная работа лепшых агітатараў сельсовета, як настаўніца Леакодзія Сідаровіч, настаўнік Садоўскі, агітатары-сяляне Руткоўскі, Івасюк, Станіслава Бенцько, Аляксандр Шпакоўскі. Яны правялі велізарную масавую агітацыйна-палітычную работу па агітацыі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Добра працавалі члены ўчастковай выбарчай камісіі і актыў з мясцовага насельніцтва. Тут праявілі сябе настаўнікі Іосіф Садоўскі і Леакодзія Сідаровіч, хатняя гаспадыня Станіслава Бенцько. Яны многа папрацавалі над мастацкім афармленнем ўчастка.

У выніку ўсёй работы 15 снежня а палове 6-й гадзіны раніцы на ўчастак з'явіліся больш 60 чалавек. Першай прагаласавала 61 гадовая былая батрачка Мар'яна Палівайка. Прагаласаваўшы, яна сказала: «Я галасую за кандыдатаў нашага народа. Раней выбіралі багатых — памешчыкаў і іншых крывапіўцаў, а зараз мы самі выбіраем сваіх лепшых людзей з нашага працоўнага народа».

К 9 гадзінам раніцы ўсе выбаршчыкі вёскі Каліноўка-Касцельная з'явіліся на ўчастак і аддалі свае галасы за блок комуністаў і беспартыйных.

Д. М. Лемяшонак,
намеснік старшыні Каліноўка-Касцельніцкай участковай выбарчай камісіі.

Г. БАЙДУКОЎ, Д. ТАРАСАЎ, Б. ЧЫРСКОЎ.

„Валерый Чкалаў“

(Урывак з сцэнарыя).

Трыбуна.

На адной з трыбун, паблісквагочы меддзю грандыёзны зводны аркестр.

Дыктар з мікрафонам—на фоне трыбун, поўных народа,—аб'яўляе:

— Паядынак паміж двума навейшымі скораснымі знішчальнікамі: пад нумарам першым амерыканскі скорасны знішчальнік, пад нумарам другім—совецкі скорасны знішчальнік манаплан «1—16»... Увага, самалёты рыхтуюцца да старта.

Поле аэрадрома.

У стрыманым узбуджэнні Ягор забіраецца ў кабіну самалёта № 1... і, дапамагаючы яму, з паспешнай заклапочанасцю секунданта на рынгу, напутствуе яго малады бортмеханік:

— Толькі сам не здай, Ягор, а машынка ў іх... Я даведаўся... Камісіяй бракованая, не манеўровая...— Трывожны погляд у бок саперніка.—А Чкалаў... Што нам Чкалаў!

Гучаць аддаленыя аркестры.

Чкалаў ля сваёй машыны. Пачынае знімаць крухмальнае сваё абсталяванне.

Пал Палыч прыняў шляпу, каўнер, трывожна пазіраючы ў бок сапернікаў, гудзіць:

— Небяспечны ў іх каршунок. Амерыканец! Механік, кобель, не падпускае да машыны... (Прымае крухмальны панцыр манішкі). Але цудоўная, прах яе вазьмі... Што да чаго ў ёй—зразумець немагчыма... Толькі чую—манеўровая, гадзюка.

Чкалаў неабуральна слухае, уважліва прыплюшчыўшы вока, пазірае самалёт праціўніка... Трэск матора... Бліскаючы белым лакам акругленага і гладкага корпуса, прыгожа разгарнулася машына Ягора. Ліха руліць да старта...

Чкалаў ужо ў камбінезоне (востра ўглядаецца) ухвальна кідае:

...Мастак... Бродскі...

З раўнівым захапленнем аглядаецца Пал Палыч, засцёгваючы яму камбінезон.

Ягор даў поўны газ, і самалёт зараўеўшы, пакаціўся і імкліва ўзвіўся ў неба.

Трыбуна.

Па-святочнаму апранутыя ўзбуджаныя натоўп штатскіх гасцей, пазіраючых палёты...

Дыктар ля мікрафона, які сочыць за ўзлётам:

— Зараз самалёты разыйдуцца для арыентыроўкі мясцовасці, каб затым зайсці і з зыходных пазіцый пачаць бой...—Асекся.—Што-ж гэта яны?!

Смех лётчыкаў.

Абодва знішчальнікі нечакана з страшэннай хуткасцю панесліся насустрач адзін другому...

Рэў матораў успорвае паветра.

Поле аэрадрома.

Лётчыкі, якія забраліся на крыллі самалётаў, на вежы баявых караблёў, замёрлі...

Пал Палыч і радам з ім бортмеханік Егора ўпіліся вачыма ў неба.

— Ага... — задыхаючыся, прысядае Пал Палыч, ткнуўшы кулаком у бок хлопца: — Звернеш, малады чалавек!

Хлопец з яраснымі вачыма сунуў яму ў нос фігу.

Нясуцца проста насустрач адзін другому знішчальнікі. З страшэннай хуткасцю скарачаецца паміж імі прастора.

Механік Ягора з скажоным тварам:

— Паб'юцца, зверы... — Схапіў Пал Палыча за плечы, ярасна трахнуў.—Зварачвай, чорт!

Пал Палыч, не адрываючы ад неба адчаяных вачэй, дрыжачы, як у ліхаманцы, паказвае яму кулакі.

Зближаюцца самалёты.

Кабіна амерыканскага самалёта.

Палаючы азартам малады твар Ягора. Вочы накіраваны ўперад... Рука, нерухома заціснуўшая штурвал...

Праз яго галаву з падвоенай хуткасцю сустрэчнага руху імкліва насоўваецца знішчальнік Чкалава.

Знішчальнікі імчацца друг на друга ў лоб. Паміж імі паўтараста метраў... сто...

— Валерка, Валерка... — дрыжыць, як у ліхаманцы, Пал Палыч.

Вачыма вар'ята Пал Палыч і бортмеханік Ягора паглядзелі адзін на другога і, адначасова замахаўшы рукамі, закрычалі:

— Зварачвай!

Хлопец схапіўся за галаву і звёз кепку на вочы.

Кабіна амерыканскага самалёта.

Грукат матора. Пабляднеўшы і востры твар Ягора, накіраваная ўперад рука, якая ўпілася ў рукаятку ўпраўлення.

Жудасна блізка нясецца на яго стальная лавіна чкалаўскага знішчальніка.

Кабіна «1—16».

Упорна акамянеўшы, Чкалаў, увесь накіраваны ў адну точку ўперадзе... Рукі. заціснуўшыя ўпраўленне, замерлі, не рухаюцца...

Самалёты, якія зближаюцца, раптам абодва адначасова папаўзлі ўверх і, амаль крануўшыся друг друга брухам, разышліся імельманамі.

Трыбуны.

Гіганцкі ўздых аблягчэння ўсяго аэрадрома. Гром апладысментаў.

Поле аэрадрома.

Пал Палыч, лікуючы, цярэбіць свайго ворага:

— Ачніся, расплюшчы вочы, цялё...

Хлопец адымае ад твара кепку.

— Бачыў?

Ашалеўшы хлопец:

— Бачыў?..

— Чкалаў?

— А Ягор?!—акрысіўся зноў ажыўшы хлопец, але зараз-жа абодва паспешна задзіраюць галовы к небу.

У паветры разлютаваная драка. Па чарзе, не даючы праціўніку апынуцца ў сябе ў хвасце, знішчальнікі лезуць уверх у бесперапынных крутых разваротах.

Голас дыктара паясняе тактыку бою:

— Абодва праціўнікі стараюцца зайсці адзін другому ў хвост для атакі...

Пал Палыч крычыць гучна:

— Давай, Валер Палыч, давай!...

—Да хлопца ў захапленні:—Буйвал! У жыцці не памятаю, каб адступіў...

Нечакана самалёт № 1 выходзіць у каманднае становішча...

Чкалаў рэзкімі фігурамі імкнецца вырвацца...

Голас дыктара:

— Самалёт № 1 заняў выгадную пазіцыю... Чкалаў вымушан адступаць...

— Цялё твой буйвал!... — крыкнуў механік Ягора і насунуў Пал Палычу кепку на нос.

Самалёт Чкалава ўцякае ад самалёта № 1, які вось-вось сядзе яму на хвост.

Чкалаў робіць бурную серыю раптоўных эвалюцый і аказваецца на хвасце ў самалёта № 1.

— Дай, дай яму, Ягор...—енчыць у трывозе механік Ягора.

Пал Палыч з надзеяй прыадкрывае кепку, убачыў, зноў загарэўся:

— Раззлаваўся Чкалаў, зусім раззлаваўся... Прапаў Ягор!—Ссунуў на нос кепку ягораву хлопцу.

Але яшчэ раз знішчальнік Ягора бліскучым каскадам фігур вырваўся з-пад Чкалава і моцна насеў на яго...

Трыбуны. Гром апладысментаў на трыбунах.

Поле аэрадрома.

Ярасна хлопаюць і, сарваўшы шлемы, махаюць імі лётчыкі, абляпіўшыя машыны.

Трыбуны.

Дыктар тонам рэплікі пад занавес:

— № 1, прымяніўшы ўлюбёны самім Чкалавым манеўр, безумоўна, вымушае Чкалава здацца...

Аэрадром.

Самалёт Чкалава, пікіруючы, камнем ляціць уніз. Пад гром апладысментаў, таксама пераходзячы ў піке, яго неадступна праследуе самалёт № 1.

Трыбуны.

Натоўп, які бурна апладыруе вакол канструктара, трывожна ўпіўшагася вачыма ў неба.

Голас дыктара:

— Чкалаў пастаўлен у такое становішча, калі знішчальнік «1—16», відавочна, уступаючы па сваіх аэрадынамічных якасцях...

— Не веру!! Не можа быць!—енчыць незвычайна абураны і ярасны канструктар.

Дыктар:

— ...Не ў стане хутка выйсці з такога маланкавага пікіравання... Гэта пагражае разбурэннем машыны і пагібеллю лётчыка...

Аэрадром.

Камнем ляцяць уніз дзве машыны.

— ...Зараз, у сапраўдным баі, № 1 мог-бы расстраляць Чкалава, так як...

Голас абарваўся. Замерлі трыбуны.

Ягор, не ў стане вывесці сваю машыну з піке, праносіцца міма, уніз, і, калі яму ўдаецца выраўняць машыну, Чкалаў радам крутых паваротаў моцна насеў на № 1.

— ...Не даючы разгарнуцца праціўніку, прыціскаючы яго да зямлі...

Пераможаны Ягор ідзе на пасадку.

Чкалаў нізка праносіцца пад ім. Загрымелі аркестры. Гул апладысментаў і крыкаў пракатваецца па аэрадрому.

Поле аэрадрома.

Механік Ягора сам марудна насоўвае кепку сабе на вочы.

— Ура-а — крычыць багровы Пал Палыч, пераможна азіраючыся па баках, раптам замірае, прыпыніўшы вочы. Зрывае кепку з галавы хлопца, задыхаючыся ад захаплення:—Глядзі, хто нам хлопае!

Урадавая трыбуна.

Гул апладысментаў. Сталін, праводзячы задаволенымі вачыма самалёт, моцна апладыруе. Серго Орджанікідзе тэмпераментна расказвае яму, відавочна, гісторыю падзення Чкалава ў гэтай машыне на заводскім аэрадроме.

— А вось цяпер даказаў!—усклікае задаволены Серго.

Сталін, не адрываючы вачэй ад чкалаўскай машыны, ківае галавой, смяецца, моцна апладыруе.

КОМСАМОЛЬЦЫ--ДОБРЫЯ ПАМОЧНІКІ КАМАНДАВАННЯ

Два дні працягваўся справаздачна-выбарчы сход комсамольскай арганізацыі Н-скай часці.

Дакладчык, намеснік палітрука тав. Кацелевец і выступаючыя таварышы аднадушна адзначылі, што комсамольская арганізацыя на працягу ўсяго справаздачнага перыяда з'яўлялася добрым памочнікам камандавання ў справе падняцця на яшчэ вышэйшую ступень баявой і палітычнай падрыхтоўкі байцоў. Комсамольцы паказваюць прыклад несаюзнай моладзі і вядуць яе за сабой.

Перадавая роль комсамольцаў відаць на кожным кроку. Дзесяткі комсамольцаў арганізацыі ўзнагароджаны наркомам абароны нагруднымі значкамі «Выдатнік РСЧА».

Комсамольцы паўсядзённа павышаюць свой палітычны кругазор. 82 процанты комсамольцаў па палітычных занятках маюць толькі выдатныя і добрыя ацэнкі. Лепшымі з іх з'яўляюцца тт. Абраменкоў, Цераxaў, Трухін і многія іншыя.

Многае можна сказаць аб чырвонаармейцу Абраменкову. У армію ён прышоў малападрыхтаваным. Зараз ён адзін з лепшых актывістаў комсамольскай работы, культурны, развіты малодшы камандзір, паўсядзённа чытае мастацкую літаратуру, многа працуе над вывучэннем «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», над XII раздзелам вучэбніка. Партарганізацыя прыняла яго ў кандыдаты ВКП(б).

Комсамольцы ідуць у авангардзе і ў баявой падрыхтоўцы. Перадавікі дапамагаюць слаба авалодаўшым тымі ці іншымі элементамі баявой вучобы. Лепшымі з іх з'яўляюцца комсамольцы тт. Маркееў, Чэркін, Фастоўскі, Дземас, Усікаў, Стакоз і іншыя. Камандаванне часці за паспяховае авалоданне гэтымі таварышамі баявой і палітычнай падрыхтоўкай аб'явіла ім па 15 і больш удзячнасцей кожнаму.

Усе ў часці ведаюць комсамольцаў тт. Непомнящчага, Салія і Чэркіна, якія з'яўляюцца лепшымі стралкамі з баявога аружжа. Нязменны рэзультаты іх стральбы — 30 ачкоў з 30 магчымых.

Комсамольцы з'яўляюцца ініцыятарамі ў арганізацыі культурнага адпачынку байцоў, арганізуюць самадзейнасць. У выхадныя дні праводзяць здачу норм на значок «Гатоў да працы і абароны».

На ўсіх участках работы комсамольцы—добрыя памочнікі камандавання.

Н. Кочкін,
малодшы палітрук.

Забытая арганізацыя


Комсамольская арганізацыя 5-га тэкстыльнага камбіната налічвае ў сваіх радах 15 членаў. На камбінаце працуе каля 400 маладых рабочых і работніц. Сярод іх ёсць многа стаханаўцаў і добрых грамадскіх работнікаў, дастойных быць членамі ленінска-сталінскага комсамола. На камбінаце ёсць вялікія магчымасці для росту комсамольскай арганізацыі за лік перадавых людзей.

Між тым арганізацыя камбіната за апошні час спыніла свой рост. З ліпеня па снежань месяц тут не прынята ў комсамол ні аднаго чалавека. Гэта—вынік таго, што комсамольская арганізацыя не вядзе работу сярод несаюзнай моладзі. На нізкім узроўні вядзецца і ўнутрысаюзная работа. Сходы, нарады з несаюзнай моладдзю не праводзяцца.

На камбінаце створана комсамольска-маладзёжная брыгада. Гэта брыгада паказвае высокія вытворчыя паказчыкі. Аднак выхаваўчая работа сярод членаў комсамольска-маладзёжнай брыгады не праводзіцца.

Беластоцкі гарком комсамола і партыйная арганізацыя камбіната не кіруюць работай гэтай арганізацыі. З красавіка ў ёй ужо змянілася 4 сакратары. Былы сакратар тав. Бабакова трэстам пераведзена на іншую фабрыку. Аб гэтым добра вядома гаркому, але справаздачу аб сваёй дзейнасці тав. Бабакова перад арганізацыяй яшчэ не зрабіла.

П. Лапцеў.



У Аўгустоўскай МТС Беластоцкай вобласці, заканчваецца рамонт трактараў да 2-й бальшэвіцкай вясны.

На здымку: (злева направа) трактарысты Карташоў П. Л. і Архіпаў Г. Я. рамантуюць задні мост трактара.

Фота Т. Кажарынава.

ВЯЛІКІЯ ЗМЯНЕННІ

КОЛЬНА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У недалёкім мінулым большасць сялянскіх гаспадарак Кольнаўскага раёна былі беззямельнымі і малазямельнымі. 17 памешчыкаў мелі 6.514 гектараў зямлі ў той час, як 6.984 сялянскіх гаспадаркі мелі толькі 32.570 гектараў, што складае ў сярэднім 4,6 гектара на адну бядняцка-серадняцкую гаспадарку.

581 сялянскіх двароў зусім не мелі зямлі. Сяляне вымушаны былі працаваць ад зары да зары на памешчыкаў і кулакоў. 1.053 сялянскіх двароў былі бясконнымі. У горадзе Кольна налічвалася звыш тысячы беспрацоўных.

Пасля ўстанаўлення совецкай улады раён змяніў сваё аблічча, змянілася і жыццё працоўных. 3.661 гектар памешчыцкай зямлі былі аддаены беззямельным сялянам, 314 бясконных сялян атрымалі коней, і 156 гаспадарак—кароў.

Перадавая частка сялянства раёна стала на новы шлях вядзення гаспадаркі—132 сялянскіх сям'і аб'ядналіся ў тры калгасы. Іх масіў зямлі складае 818 гектараў.

Для аказання дапамогі калгасам і аднаасобнікам раёна створана машынна-трактарная станцыя, якая налічвае 10 трактараў і іншыя сельскагаспадарчыя машыны.

У раёне не было ні адной лячэбна-прафілактычнай установы. Была толькі так званая «каса хворых», дзе працаваў адзін урач, які прымаў толькі членаў гэтай касы па дзве гадзіны ў тыдзень. Тры ўрачы, якія былі ў раёне, за аказанне медыцынскай дапамогі бралі вялікія грошы. Пераважнай большасці насельніцтва такое лячэнне было недаступна.

За год з лішнім совецкай улады ў раёне адкрыты лячэбна-прафілактычныя ўстановы, у горадзе Кольна—раённая бальніца на 35 ложкаў, радзільны дом, амбулаторыі і іншыя лячэбныя ўстановы. Совецкім урадам адпушчаны на ахову здароўя працоўных вялікія сродкі.

У раёне было 36 школ і 80 настаўнікаў, зараз ёсць 46 школ, у іх навучаецца 6.300 дзяцей, працуе 180 настаўнікаў. На народную асвету ў гэтым годзе адпушчана 15 мільёнаў рублёў.

З ліку мясцовага актыва выраслі выдатныя кадры. На кіруючую работу ў совецкія, кааператыўныя і іншыя арганізацыі вылучана звыш 200 чалавек.

Такія змяненні адбыліся пры совецкай уладзе ў Кольнаўскім раёне.

П. Грышчанка.

УЗОРНА ПРАВЕСЦІ ПЕРАПІС ЖЫВЁЛЫ

Згодна рашэння Совета Народных Камісараў СССР, з 1-га па 8-е студзеня 1941 г. будзе праводзіцца Усесаюзны перапіс жывёлы, а ў калгасах—і перапіс хатняй птушкі.

Асноўная задача перапісу—даць дакладныя і вычарпальныя даныя аб колькасці жывёлы, паказаць, як выконваецца гістарычнае рашэнне XVIII з'езда ВКП(б) па развіццю жывёлагадоўлі. Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для ўздыму грамадскай жывёлагадоўлі. Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб змяненні сістэмы паставак дзяржаве мяса, воўны, скур-сыравіны з'явілася магутным стымулам для далейшага павелічэння пагалоўя жывёлы. Комуністычная партыя і асабіста тав. Сталін няспынна сочаць за развіццём жывёлагадоўлі і штодзённа дапамагаюць нашым калгасам узнімаць гэту важнейшую галіну гаспадаркі. Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка з яркай пераканаўчасцю паказала, якіх велізарнейшых перамог дабіліся калгасы ў развіцці жывёлагадоўлі.

Гістарычны XVIII з'езд ВКП(б) паставіў задачу—дабіцца ў трэцяй пяцігодцы прыросту пагалоўя жывёлы і таварнай прадукцыі жывёлагадоўлі ў размерах, поўнасцю забяспечваючых вырашэнне праблемы жывёлагадоўлі ў СССР. План трэцяй пяцігодкі па жывёлагадоўлі адрозніваецца больш высокімі тэмпамі росту. Пагалоўе за годы трэцяй пяцігодкі павінна павялічыцца: па конях на 35 процантаў, буйнай рагатай жывёле на 40 проц., свіннях—на 100 проц., авечках і козах—на 110 процантаў.

Праграма перапісу цалкам падпарадкавана патрабаванням, якія зыходзяць з пастановы СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах. Перапіс пакажа агульны лік пагалоўя жывёлы па ўзрасных і палавых групах і па катэгорыях гаспадарак.

Перапіс пакажа колькасць ферм буйнай рагатай жывёлы, аўцагадоўчых і свінагадоўчых. Вынікі перапісу дадуць магчымасць устанавіць, што канкрэтна зроблена кожным калгасам, соўгасам па выкананню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) і што трэба будзе зрабіць. Перапіс абавяжа работнікаў жывёлагадоўлі, праўленні калгасаў, дырэктараў соўгасаў і кіраўнікоў раённых арганізацый зноў праверыць становішча жывёлагадоўлі ў кожным соўгасе, калгасе і намеціць далейшыя шляхі яго ўздыму.

Удзельнікі перапісу пад кантролем шырокай грамадскасці павінны не толькі ўлічыць пагалоўе жывёлы, але высніць і рад іншых пытанняў, як утрыманне жывёлы, забяспечанасць яе кармамі на зіму, развіццё кармавой базы, забяспечанасць вытворнікамі, захаванне прыплоду і т. д.

Перад органамі народна-гаспадарчага ўчоту пастаўлена вялікая задача—правесці перапіс у тэрмін, дакладна па інструкцыі і даць ўраду правільныя лічбы. Пры рашэнні гэтай задачы работнікам Наргасучоту павінны аказаць усямерную дапамогу мясцовыя совецкія, партыйныя і грамадскія арганізацыі. Яны павінны правесці шырокую растлумачальную работу сярод насельніцтва аб значэнні і задачах прадстаячага перапісу, растлумачыць абавязкі счотчыкаў і насельніцтва.

Вопыт правядзення ўчоту жывёлы на 20 верасня 1940 г. паказаў, што там, дзе з боку раённых партыйных і совецкіх арганізацый недастаткова была праведзена растлумачальная работа сярод насельніцтва—гэта было выкарыстана класавымі ворагамі, якія распаўсюджвалі сярод насельніцтва ўсялякія хлуслівыя чуткі, падгаварвалі сялян хаваць жывёлу, асабліва гэта мела месца ў Монькаўскім, Гродненскім і Дамброўскім раёнах. Цяпер сяляне добра ўпэўніліся, што гэтыя чуткі распаўсюджваў класавы вораг.

Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі павінны аказаць садзейнасць раўінспектарам Наргасучоту ў падборы неабходнай колькасці палітычна правераных і тэхнічна граматных счотчыкаў, брыгадзіраў кантрольных брыгад і загадчыкаў перапіснымі аддзеламі. Добра азнаёміць увесь перапісны персанал з інструкцыяй і стварыць усе неабходныя ўмовы для правядзення гэтай работы.

Кантроль за падрыхтоўкай і правядзеннем самога перапісу павінны узяць у свае рукі раённыя арганізацыі. Усесаюзны перапіс жывёлы—справа вялікай дзяржаўнай важнасці. Гэта абавязвае работнікаў сістэмы Наргасучоту ўзорна правесці перапіс.

С. Крукаў,
намеснік начальніка Беластоцкага абласнога ўпраўлення Наргасучоту.



У Бірабіджанскай школе № 1 арганізован фізічны гурток, які праводзіць рамонт усіх прыбораў фізічнага кабінета, абсталёўвае школьныя майстэрні і г. д.

На здымку: электрык гуртка Ч. Пахіс (злева) і Н. Тіўхова.

Фота Н. Коноваленка. Фота ТАСС.

Пакрываюць нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны

У Дамбраўскай машынна-трактарнай станцыі груба нарушаецца працоўная дысцыпліна. Тут звонку як быццам усё ў парадку: уведзен табель яўкі на работу супрацоўнікаў канторы, устаноўлен распарадак рабочага дня. Але ўсё гэта фармальна. Асобныя супрацоўнікі спазняюцца на работу, да іх ніякіх мер не прымаецца.

Аднойчы спазніліся на работу старшы механік МТС Л. Каўроў і помпаліт А. Юдашкін: першы — на 25 мінут, а другі—на 30 мінут. Прайшоў месяц, а да нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны меры не прыняты. Дырэктар МТС т. Пархамовіч стаў на шлях пакрывання дэзарганізатараў.

Г. З.

Новыя вершы

Цімох КРЫСЬКО

ЖУРАВЕЛЬ

Чаму жыццё не падняло
Яго пад хмары залатыя ?
Здавён вартуе ён сяло,
Высока выцягнуўшы шыю.

І усё цікуе—хто ідзе
Да чыстай поўнае крыніцы.
Здалёк заве, заве людзей
Вадзіцы свежае напіцца.

І нізка кланяецца, рады,
Паслушна апускае дзюбу,
Глядзіць з руплівай спагадай
У бездань выцвілага зрубу.

Нап'е сасмаглы падарожнік,
Асушыць конь сваё карыта,
А восень агалосіць пожні
Птушыным развітальным крыкам.

І ўчуўшы кліч павадыра,
Што цягне свой касяк у вырай,
Ён цягне свой касяк у вырай,
— І мне пара, і мне пара!

Ляцець, ляцець! Ды толькі хто там
З пустымі вёдрамі ў варота?
Не, мусіць, век не адчапіцца.
Ад гэтых зводніц — маладзіцаў.

Яны да цяжкага вядра
Мяне жалезам прыкавалі,
Ласкавым іменем назвалі
І не пушчаюць са двара.

Не, мусіць, не пакінуць тыну,
Не узляцець за родным клінам.

Лістапад 1940 г., г. Беласток.

Максім ТАНК

НА ГРАНІ

Вечар.
Абрываецца крутая
Горная дарога на адкос.
І лавіна ценяў ападае
У даліну вінаградных лоз:
На марскія дрэмлючыя сагі,
На блакіт гліцыній, на граніт,
Дзе вясенні піонерскі лагер
Азарылі яркія агні.
Цішыня і песня маладая.
Я на грані слухаю,
стаю.
У словах, што,як хвалі, нарастаюць,
Дні свайго юнацтва пазнаю.
Хай яно асеннімі часамі
На заходніх нівах адцвіло.
Дорага, што сонечнымі днямі
Вось да гэтай песні прывяло,
Для якой
безмежжам небасводу
Разаслаўся ясны, млечны шлях...
І якую слухаем да ўсходу
З Чорным Морам Я
і Аю-Даг.

1940 г.

КАМПАЗІТАРЫ БЕЛАСТОКА

Уся творчасць кампазітараў, аб якіх будзе ісці гутарка, не магла шырока развіцца і стаць здабыткам народа ў панскай Польшчы. Іх музыка марнела ў душных кафе, рэстаранах і не магла вырвацца на прастор.

Іосіф Самуілавіч Клінкаўштэйн скончыў Варшаўскую кансерваторыю і, па прызнанню яго настаўнікаў, з'яўляецца таленавітым музыкантам. Яшчэ будучы ў гімназіі, ён напісаў аперэту «Іх трое». Яна ішла ў тэатры горада Плоцка і мела поспех у гледача. Але вучоба яго не была нармальнай, бо Іосіф Самуілавіч вымушан быў працаваць па вечарах у кіно-тэатрах, каб зарабляць на пражыццё. Яго дзейнасць, як музыканта, распаўсюджвалася і на радыё, дзе ён кіраваў камерным саставам, і на школы, дзе ён працаваў хормейстарам і чытаў лекцыі па гісторыі музыкі. Але і тут Іосіфу Самуілавічу прыходзілася нялёгка. Над ім вісела пытанне: «Ці доўга я буду працаваць тут?» Неўзабаве яго знімаюць з работы ў радыё, як яўрэя. Цяжка было заняцца яму сапраўднай творчай работай. «Усё, што напісана мною, — гаворыць Іосіф Самуілавіч,—цяжка было выканаць дзе-небудзь. І гэта затрымлівала мой творчы рост, як кампазітара, і адбівала ўсякую ахвоту пісаць». Яшчэ працуючы ў радыё, ён піша скрыпічныя эцюды, квартэты і інш. Раней напісаў рад песень на тэксты польскіх паэтаў Канапніцкай, Тувіма і інш.

Тут, у Беластоку, Іосіф Самуілавіч сабраў 40 беларускіх народных песень, з якіх 15 ужо апрацаваў для змешанага хора. Яго песні «Калінанька», «Ой, волы», «А ў лузе» і інш. выконваюцца зараз па радыё хорам Дома народнай творчасці. Рыхтуюцца ім песні і для беларускага ансамбля песні і пляскі. Ужо ў апошні час кампазітар напісаў песню «Калыханка» на словы Янкі Купалы. Зараз працуе над сімфанічнай сюітай на беларускія тэмы, дзе ён імкнецца адлюстраваць цяжкае жыццё народа пад гнётам паноў, яго імкненне да свабоды і радасць вызвалення. У планах на будучыню—напісанне аперэты на лібрэта Я. Вашчэровіча. Максімум часу Іосіф Самуілавіч думае прысвяціць збіранню фальклора. Ён хоча аднавіць сапраўдныя народныя матывы.

— Я шчаслівы тым, што свабодна магу тварыць на карысць свабоднага чалавека і ідэі вызвалення ўсяго чалавецтва, — гаворыць Іосіф Самуілавіч.

* * *

Максіміліян Ісідаравіч Цэнтнершвер з 13-гадовага ўзросту вучыцца музыцы і жывапісу. 18-гадовым юнаком у Парыжы ён вучыўся ігры на скрыпцы, кампазіцыі, гісторыі музыкі. Затым Лейпцыг. У Варшаве Максіміліян Ісідаравіч становіцца карэспандэнтам журнала «Музыкальны агляд», дзе ён друкуе артыкулы па эстэтыцы, тэорыі і гісторыі музыкі, аб музычных з'явах сучаснасці. З 18-гадовага ўзросту піша ўласныя кампазіцыі: фартэпіянныя п'есы, квартэт з голасам і асабліва рамансы. У далейшым паяўляюцца тры кантаты: «На раках Вавілонскіх», «Праца» і «Трыстан». Затым два струнных квартэты, скрыпічная сюіта і песні з аркестрам. «Не ўсе мае творы маглі ўбачыць свет, бо мяне як яўрэя не дапускалі ў друк і ўвогуле адносіліся з пагардай»— гаворыць Максіміліян Ісідаравіч.

У Беластоку тав. Цэнтнершвер з прагнасцю ўзяўся за творчую работу. Напісаў сімфанічнае скерца на беларускую тэму, «Бульбу» і «У лесе сасна стаяла». У рабоце — струнны квартэт з варыяцыямі, 10 фартэпіянных мініятур. Максіміліян Ісідаравіч марыць напісаць рамансы на рускія і беларускія тэксты. У плане таксама многа работы рэцэнзенцкай. Зараз Максіміліян Ісідаравіч працуе ў музвучылішчы выкладчыкам гісторыі і тэорыі музыкі.

* * *

Генрых Меeравіч Яблонь з 7 год пачаў іграць на раялі і імправізіраваць музыкальныя кампазіцыі. У час вучобы ў школе ён адначасова вучыцца і кампазіцыі. На 24-м годзе па парадзе прафесара Вальфсона паступае ў «Новую Венскую кансерваторыю», дзе абучаецца мастацтву кампазіцыі і дырыжорству. У 1930 годзе, па сканчэнні кансерваторыі, пераязджае ў Лодзь, дзе пачынаецца яго самастойная творчая работа. Тут ён піша санату для раяля, трэлюды і інш. Афармляе першую праграму яўрэйскага тэатра мініятур. Далей піша танцы, яўрэйскія песні, рандо, песні на тэксты Тувіма «Вада», «Два вятры», «Усё табе аддадуць» і інш.

У Беластоку спачатку тав. Яблонь кіраваў аркестрам у кінотэатры «Спартак». Затым выканаў музыкальнае афармленне п'есы «Каварства і каханне» у Польскім дзяржаўным тэатры БССР. Капітальнай працай тав. Яблоня з'яўляецца яго музыка да «Аптымістычнай трагедыі», якую ён пісаў больш 4-х месяцаў. У гэтай музыцы ён імкнуўся паказаць гераізм эпохі грамадзянскай вайны. Яго музыкальнае афармленне ў многім адпавядае зместу і духу п'есы. З гэтай музыкі Генрых Меeравіч піша сюіту для аркестра Беластоцкай філармоніі, а таксама працуе над сімфанічнай паэмай, у якой хоча выказаць пачуцці ўдзячнасці вызваленых працоўных рускаму народу. Гэта паэма будзе называцца «Зварот».

Вялікія перспектывы перад кампазітарамі Беластока. Але для іх яшчэ не створаны ўсе ўмовы для творчай працы. Яны не маюць яшчэ памяшкання, інструментаў. Упаўнаважаны саюза кампазітараў тав. Кавалёнак у першую чаргу павінен заняцца гэтай неабходнай справай. Прынятыя членамі саюза совецкіх кампазітараў БССР кампазітары Беластока ведаюць, якая адказнасць ускладаецца на іх. Усе яны гараць жаданнем тварыць больш і лепш у славу сваёй радзімы.

А. Пакроўскі.



Талочынская арцель мастацкай вышыўкі «Чырвоны тэкстыльшчык». На здымку (злева направа): стаханаўкі-вышывальшчыцы В. А. Ермашкевіч, В. М. Крамянецкая і Р. Г. Штэйфман.

Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.

У апошнюю гадзіну

ІТАЛЬЯНСКІЯ ГАЗЕТЫ АБ АНГЛА-ІТАЛЬЯНСКАЙ ВАЙНЕ

РЫМ, 17 снежня. (ТАСС). «Джорнале д'Італіа» у нумары ад 17 снежня публікуе перадавы артыкул Гайды, у якім гаворыцца: «Аглядальнікі ўсяго свету прызнаюць, што ў цяперашні момант Італія адчувае найбольшае даўленне ўзброенай магутнасці Брытанскай імперыі, якая з самага пачатку вайны ніколі яшчэ не ўводзіла ў дзеянне такой колькасці войск і не выступала з такой рашучасцю і сілай».

«Усе рэсурсы і сродкі Італіі, — працягвае аўтар, — знайшлі сваё прымяненне ў гэтай інтэнсіўнай і дынамічнай фазе вайны на перадавых пазіцыях супроць усёй магутнасці Брытанскай імперыі і яе грэчаскага саратніка. Хоць італьянскія сродкі ў гэтай вайне ў некаторых адносінах больш абмежаваны, чым сродкі Англіі, усё-ж Італія супраціўляецца і наносіць ворагу цяжкія ўдары». Гайда запэўняе, што «ніколі яшчэ ні ў адной вайне не ўводзілася ў дзеянне такая колькасць узброеных сіл». Аўтар указвае, што Англіі не ўдасца зламіць супраціўленне Італіі.

Другія італьянскія газеты ў нумарах ад 16 і 17 снежня таксама змяшчаюць перадавыя артыкулы, прысвечаныя апошнім ваенным падзеям. Газета «Лаворо фашыста» у нумары ад 17 снежня ў перадавым артыкуле падкрэслівае важнасць цяперашняй вайны і ўказвае прычыны, па якіх ваенныя дзеянні ў Афрыцы прымаюць напружаны характар. Па словах Гайды, Англія сцягнула ўзброеныя сілы з Усхода, з Індыі, Паўднёвай Афрыкі, Аўстраліі і Новай Зеландыі. Да гэтых сіл трэба дадаць яшчэ і грэчаскія ўзброеныя сілы. У Міжземным моры сканцэнтравана значная частка англійскага флота.

—о—

ЗАЯВА ДЗЯРЖАЎНАГА ДЭПАРТАМЕНТА ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 17 снежня. (ТАСС). Дзяржаўны дэпартамент апублікаваў заяву, у якой гаворыцца, што Венгрыя ўнесла невялікую суму грошай у лік сваіх ваенных даўгоў ЗША. Іншыя-ж даўжнікі не ўнеслі сваіх чарговых узносаў к 15 снежня.

У заяве дзяржаўнага дэпартамента ўказваецца, што Англія павінна Злучаным Штатам па ваенных даўгах 5.652 мільёна долараў, Францыя—4.220 мільёнаў долараў, Італія—2.027 мільёнаў долараў.

—о—

ВЫСТУПЛЕННЕ ГРЫНА

НЬЮ-ЙОРК, 17 снежня. (ТАСС). Як паведамляе «Нью-Йорк таймс», старшыня амерыканскай федэрацыі працы Грын заявіў, што АФП поўнасцю падтрымлівае праграму нацыянальнай абароны амерыканскага ўрада. Грын падкрэсліў пры гэтым, што АФП выступае супроць забастовак на ваенных прадпрыемствах.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 17 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «У ноч на 16 снежня германскія тарпедныя кацеры, якія апeрыравалі ў Ла-Маншы, сустрэліся з злучэннем непрыяцельскіх эсмінцаў. Пасля непрацяглага бою караблі праціўніка скрыліся. Нашы тарпедныя кацеры звярнуліся на свае апорныя пункты без страт і пашкоджанняў. Капітан-лейтэнант Крэчмер, камандуючы падводнай лодкай, рапартуе аб патапленні непрыяцельскіх суднаў агульным водазмяшчэннем у 34.935 тон.

У ноч на 16 снежня злучэнні германскіх самалётаў зноў паспяхова бамбардыравалі Шэфілд. Можна было заўважыць узрывы і многа пажараў. З прычыны неспрыяючых метэаралагічных умоў у дзённых аперацыях удзельнічала невялікая колькасць самалётаў. У Лондане ўдалося скінуць бомбы на важныя ў ваенных адносінах аб'екты, транспартныя збудаванні і воінскі лагер. У 500 кілометрах на захад ад Ірландыі былі скінуты бомбы на два непрыяцельскіх гандлёвых судны. У аднаго судна пашкоджана рулявое ўпраўленне, другое так цяжка пашкоджана, што яго трэба лічыць затануўшым.

Англійская авіяцыя абмежавалася ў ноч на 17 снежня налётамі на тэрыторыю Заходняй і Паўднёва-Заходняй Германіі. У Мангейме фугаснымі і запальваючымі бомбамі пашкоджаны будынкі.

Пашкоджанні, прычыненыя двум заводам, амаль не адбіліся на іх рабоце. Сярод насельніцтва маецца 10 забітых і 50 раненых. Германская зенітная артылерыя збіла 2 самалёты. Германскія знішчальнікі знішчылі 1 непрыяцельскі аэрастат паветранай загароды. Германская авіяцыя страт не мела».

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 17 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора толькі асобным германскім самалётам удалося пранікнуць ва ўсходнюю і паўднёва-усходнюю Англію. Прычынены тут бамбардыроўкай урон невялікі, лік афяр нязначны.

Налёты германскай авіяцыі на Англію ў ноч на 17 снежня таксама былі нязначнымі. У некаторых акругах паўночна-заходняй Англіі і ў адным з раёнаў цэнтральнай часткі краіны атрымалі пашкоджанні жылыя дамы і магазіны. Сярод насельніцтва налічваецца невялікая колькасць забітых і раненых. Некалькі бомб было скінута ў Лонданскім раёне, дзе пашкоджаны жылыя дамы і іншыя будынкі. У другіх частках краіны ўрон нязначны, лік афяр невялікі.

ЛОНДАН, 17 снежня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у ноч на 17 снежня галоўны ўдар англійскай авіяцыі быў накіраваны на Мангейм. Бамбардыроўка пачалася ў 8 гадзін вечара 16 снежня і працягвалася да раніцы 17 снежня. На многія аб'екты, якія маюць ваеннае значэнне, былі скінуты бомбы, у рэзультаце чаго ўзнікла многа пажараў.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

АФІНЫ, 17 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора на разнастайных участках фронта адбываліся паспяховыя аперацыі мясцовага значэння. Адзначана частковае прасоўванне грэчаскіх войск.

На ўнутраныя раёны Грэцыі італьянцы не вытваралі ўчора ні аднаго налёта.

НЬЮ-ЙОРК, 17 снежня. (ТАСС). Па паведамленнях амерыканскага друку, грэчаскія войскі пасля вулічных рукапашных баёў, працягваўшыхся ўвесь дзень, занялі ўчора Тэпелене. Італьянцы адступаюць ад горада па дарозе, якая вядзе праз горад Трэбесіна. На абодвух баках маецца многа афяр. На паўднёвым фронце грэчаскія часці занялі порт Хімара, у 25 мілях на поўдзень ад Валоны. Не гледзячы на моцныя снегапады, грэчаскія войскі працягваюць прасоўванне ўперад.



Прадстаўнік грэчаскага ўрада заявіў, што грэкі ўжо адбілі 7 італьянскіх спроб зноў авалодаць важнейшым стратэгічным пунктам паміж Хімарай і Тэпелене — гарой Скіовік. Італьянцы панеслі сур'ёзныя страты. На паўночным фронце адзін сільна ўмацаваўшыйся італьянскі атрад усё яшчэ ўтрымлівае свае пазіцыі ў гарах у раёне возера Охрыда.

Праводзячы тут атакі на італьянскія перадавыя пасты, грэкі занялі некалькі новых пунктаў.

Англійскія самалёты ўзмацнілі бамбардыроўкі Валоны. У Грэцыю прыбыло новае папаўненне англійскіх бамбардыроўшчыкаў і знішчальнікаў.

БЕЛГРАД, 17 снежня. (ТАСС). Учора раніцой грэкі атакавалі адну горную вяршыну паблізу Паградзеца. Італьянцы аказалі супраціўленне, аднак вымушаны былі некалькі адступіць. У раёне Москаполе пасля ўпорнага бою грэкі таксама занялі новыя пазіцыі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ПУСТЫНІ

ЗАНЯЦЦЕ АНГЛІЧАНАМІ СОЛУМА І ФОРТА КАПУЦО

ЛОНДАН, 17 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, англійскія войскі занялі ўчора Солум (егіпецкі порт на граніцы з Лівіяй) і форт Капуцо (лівійскі пункт па граніцы з Егіптам). Захоплена некалькі знаходзіўшыхся на зямлі самалётаў.

«ДЖОРНАЛЕ Д'ІТАЛІА» АБ КОЛЬКАСЦІ АНГЛІЙСКАЙ АРМІІ У ПАЎНОЧНАЙ АФРЫЦЫ

РЫМ, 17 снежня. (ТАСС). Па даных газеты «Джорнале д'Італіа», англійскае камандаванне сканцэнтравала ў паўночнай Афрыцы армію колькасцю ў 300 тысяч чалавек, дастаўленых з розных часцей Брытанскай імперыі, 800 танкаў і бронеаўтамабіляў.



ЗВОДКА ІТАЛЬЯНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

РЫМ, 17 снежня. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе: «Баі ў пустынным раёне на фронце Кірэнаікі працягваюцца з такой-жа жорсткасцю, як і ў мінулыя дні. Не гледзячы на выключна неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, італьянская авіяцыя аказвае падтрымку супраціўляючымся войскам. Праціўніку нанесены значныя страты. Італьянскія самалёты — тарпеданосцы скінулі дзве тарпеды на бамбардыраваўшы Бардзію непрыяцельскі крэйсер вадазмяшчэннем у 6 тысяч тон. 5 нашых самалётаў не вярнуліся на свае базы.

Ва ўсходняй Афрыцы адзначаецца актыўнасць патруляў і артылерыі.

На грэчаскім фронце ў раёне 9-й арміі — без перамен. У раёне 11-й арміі адбываецца жорсткая бітва».

ДА ПАДЗЕЙ У ІНДА-КІТАІ

НЬЮ-ЙОРК, 17 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, паміж войскамі Таі і Інда-Кітая адбыўся поўгадзінны пагранічны бой. У ноч на 16 снежня бамбардыроўшчыкі Таі зрабілі налёт на горад Чэом Ксан у паўночна-заходняй частцы правінцыі Камбоджа. Французскія самалёты ў выглядзе рэпрэсіі бамбардыравалі гарады Таі—Лакон і Кемарат.

Французскі пасланнік у Бангкоку інфарміраваў Ханой аб тым, што перспектывы мірнага вырашэння канфлікта некалькі палепшыліся.

ВІШЫ, 17 снежня. (ТАСС). У сувязі з пачаўшыміся ваеннымі сутычкамі паміж Таі і Інда-Кітаем, у Вішы заяўляюць, што ў Таі прызвана зараз каля 300 тысяч чалавек.

Дэкада совецкай музыкі ў Беластоку

Дэкада совецкай музыкі — гэта вялікае культурнае свята ўсіх народаў СССР. У дэкадзе ўдзельнічае звыш 30 гарадоў, выдатныя сімфанічныя калектывы, сотні выканаўцаў-салістаў: спевакоў і інструменталістаў. Вызваленыя вобласці Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ўдзельнічаюць у дэкадзе першы раз. Асноўная мэта—пазнаёміць маладых грамадзян Совецкага Саюза з сучаснай творчасцю, вылучыць новых кампазітараў і выканаўцаў, якія за гэты год паказалі сябе як актыўныя работнікі мастацтва.

За арганізацыю дэкады совецкай музыкі ўзялася і наша Беластоцкая дзяржаўная філармонія. У яе шырока намечаным плане прадугледжваецца выкананне сімфанічных твораў: Кабалеўскага, Хрэннікава, Хачатурана, Шастаковіча, Касенка, Столава і многіх іншых. Брыгада артыстаў Ленінградскай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі ўдзельнічае ў дэкадзе як выканаўцы папулярных рамансаў і оперных фрагментаў. Сярод іх пачэснае месца займаюць творы Дзержынскага, Чышко і Кабалеўскага. Артысты Беластоцкай філармоніі Бакман і Калецкі выступалі як салісты: першы—з тонкім густам сыграў дзве часткі санаты Шастаковіча, другі супрацоўнічаў у выкананні твораў маладога беларускага кампазітара Столава. Той-жа Столаў з поспехам выступаў як дырыжор і скрыпач, што сведчыць не толькі аб размерах, але і ўсебаковасці яго музыкальных дараванняў.

Удзел Столава ўзняў музыкальную цікавасць двух да гэтага часу праведзеных сімфанічных канцэртаў (9 і 10 снежня). Слухачы гэтых канцэртаў пазнаёміліся з пяццю вялікімі творамі кампазітара: з сімфанічнай паэмай і увертурай, рапсодыяй на яўрэйскія тэмы для фартэпіяна з аркестрам, сюітай для скрыпкі, з фартэпіяна і першай часткай канцэрта для скрыпкі з аркестрам. Такі розны па музыкальнаму зместу матэрыял дае дастаткова падстаў для ацэнкі здольнасцей кампазітара.

Столаў, па-першае, добра адукаваны музыкант. Ён ведае тэхніку аркестра і асобных інструментаў і ўмее скарыстаць іх з густам і майстэрскім вынаходніцтвам. Яго інструментальная палітра маляўнічая і празрыстая. У ёй няма мутных плям і непатрэбных згусткаў. Рытміка непасрэдная і разнастайная, а тэмы добра арганізаваныя. Захоўваючы свой творчы воблік, яны адначасова добра ўспрымаюцца слухачом, даюць яму прыемнае музыкальнае задавальненне.

У неаднолькавай ступені сказваецца ў Столава пачуццё формы. Яна ўнушальна ў сімфанічнай паэме, лёгкая і празрыстая ў увертуры, своеасаблівая, як і павінна быць, у яўрэйскай рапсодыі, але недастаткова распрацавана ў сэнсе манументальнасці ў першай частцы скрыпічнага канцэрта. Вядома, па адной частцы, выкананай у суправаджэнні раяля, цяжка ацаніць цэлы твор. Аднак трэба падкрэсліць, што ў ёй не заўважаецца таго размаху, які чакаецца ад першай часткі санатнай формы. Тэхнічныя праблемы вычарпаны ў канцэрце цікава: адразу відаць, што яго пісаў вопытны скрыпач. Столаў — добры выканаўца сваіх і чужых твораў. У яго заўсёды ясны план і знаёмства матэрыялу.

Добрым супрацоўнікам Столава аказаўся канцэртмейстар Калецкі, які ў партыі фартэпіяна даў узор выканальніцкай свабоды, тэхнічнай лёгкасці і музыкальнага астраум'я.

Сярод твораў іншых кампазітараў трэба адзначыць некалькі цяжкавесную «Урачыстую увертуру» Касенка і жыццерадасную увертуру Кабалеўскага да оперы «Кола бруньён». У інструментальнай распрацоўцы увертуры відаць майстэрства і вялікі тэмперамент кампазітара. Адчуваецца, што ў распараджэнні яго знаходзяцца разнастайныя сродкі музыкальнага ізлажэння і што ён карыстаецца імі з вялікім творчым уздымам.

Вакальную частку праграмы выканала брыгада ленінградскіх супрацоўнікаў дзяржаўнай філармоніі: Шумская, Мамдзей, Тоўры, Лапшэнкоў, Холмін, Закедскі. Вельмі падабалася выкананне песень, якія спявалі артысты Лапшэнкоў і Закедскі; астатнія выканаўцы таксама мелі немалы поспех. Акампаніраваў піяніст Коры.

М. Цэнт.

Вялікія змены

З кожным днём мяняецца выгляд вёсак нашай вобласці. Не пазнаць цяпер сяла Крыпна, Кнышынскага раёна.

У мінулым жыхары сяла Крыпна вымушаны былі звярачвацца за медыцынскай дапамогай у горад Беласток. Тут не было нават прыватнага фельчара. Зараз зусім іншая карціна. У сяле адкрыта амбулаторыя, зубаўрачэбны і акушэрскі пункты. У цэнтры сяла абсталявана хата-чытальня, сельская бібліятэка, адкрыт кааператыў.

Сяляне праяўляюць вялікую цікавасць да навукі, ведаў. Вячэрнюю школу дарослых наведваюць 70 мужчын і жанчын. Раней у сяле толькі 5 чалавек выпісвалі газеты. Цяпер штодзённа паштовае аддзяленне сяла атрымлівае 150 экземпляраў цэнтральных і абласных газет і 50 экземпляраў журналаў. Чытачамі бібліятэкі з'яўляюцца 120 чалавек.

Яшчэ большыя дасягненні ў справе народнай асветы. У сяле працуе чатыры пачатковых школы. Усе дзеці сялян вучацца ў школах. Лік вучняў у іх за год павялічыўся на 150 дзяцей. У сяле вырасла новая інтэлігенцыя. Гэта — настаўнікі, урачы, работнікі кааперацыі, сельскага совета і іншых сельскіх устаноў.

В. Г.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара — 17-62, адказнага сакратара — 49, аддзелаў прапаганды і партыйнага — 16-10, эканамічнага аддзела — праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя — 14-32.

УБ—132. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук